*Марыя Кушнір*

# ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ХАРЭАГРАФІЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ

Фальклор у цэлым і харэаграфічны фальклор у прыватнасці ўяЎляе сабой мастацкую калектыўную творчасць народа, у якой адлюстроўваецца яго жыццё, погляды, ідэалы, выяўляюцца адметныя рысы гісторыі, псіхалогіі, ментальнасці, побыту. Найбольш старажытныя формы фальклору выконвалі магічную функцыю, з'яўляючыся сакральным дзеяннем, накіраваным на дасягненне пэўных практычных мэтаў. Пануючымі спосабам мыслення нашых продкаў былі сімвалічны і аналагічны ў адрозненне ад сучаснага лагічнага, адкуль вынікае істотнасць любога сакральнага дзеяння, у тым ліку танца.

Харэаграфічная народная творчасць характарызуецца сёння складанасцю вывучэння ў сувязі з існаваннем праблемы вербалізацыі аўтэнтычнага танцавальнага матэр'ялу, бо тэхнічныя мажлівасці (відэафіксацыя) з'явіліся на некалькі дзесяцігоддзяў пазней за знікненне носьбітаў жывой традыцыі. Таму танцавальная народная творчасць прадстаўлена мінімальнай колькасцю выданняў, найбуйнейшымі з якіх з'ўляюцйз «Бепарускі харэаграфічны фальклор», «Беларускі народны танец» Ю.М.Чурко, электронная версія - складальнік С.В. Гуткоўская, «Беларускія народныя танйы, карагоды, гульні» Л .КАлексюговіч і інш.

Да пытання навуковага даследвання і дыферэнцыяцыі беларускага танцавальнага фальклору звярталіся Л.К.Алексютовіч, прафесар Ю.М.Чурко, М.А.Козенка, але пэўныя моманты класіфікацый аўтараў маюць некалькі штучны характар. Пад класіфікацыяй (ад лац. classis - разрад, клас) разумеецца ўпарадкаванне паняткаў і прадметаў паводле пэўных прынцыпаў, законаў, прыкметаў як яе асновы [4, с. 311-312]. Сутнасць праблемы існуючых класіфікацый беларускага харэаграфічнага фальклора заключецца ў недапрацаванасці сістэмы, у адсутнасці лагічна абгрунтаваных адзіных крытэраў, паводле якіх адбываецца дыферэнцыяцыя харэаграфічных узораў. Узгаданыя намі сістэмы аўтараў дастаткова адрозныя, маюць розныя аспекты класіфікацыі, не прыведзеныя да адзінага меркавання.

На наш погляд, найбольш слушнай з'яўляецца класіфікацыя беларускага харэаграфічнага фальклора на групы карагодаў, танцаў і скокаў. Дыферэнцыяцыя ў гэтым выпадку адбываецца на падставе крытэра жанру, дзе групы вылучаюцца пры дапамозе выяўлення марфалагічнай структуры танца. Дадзены прынцып класіфікацыі быў вынайдзены прафесарам Ю.М.Чурко, і выкарыстоўваецца таксама ў працах М.А.Козенкі. Класіфікацыя Л.К.Алексютовіч не мае акрэсленага крытэру, бо аўтар акрамя вышэй азначаных груп карагодаў, танцаў і скокаў вылучае асобна гульні, полькі і кадрылі.

Паводле прафесара Ю.М.Чурко, група танцаў складаецца з беларускіх традыцыйных танцаў, кадрыляў, полек, гарадскіх-бытавых танцаў. Крытэрам класіфікацыі аўтара з'яўляецца марфалагічная структура харэаграфічнага ўзору, што мае пад сабой лагічна абумоўленыя падставы [6, с. 16-19]. Падобную дыферэнцыяцыю танцавальнага фальклору распрацаваў М.А.Козенка, але ў аўтара побач з падгрупамі танцаў-«прыхадняў» кадрылі і полькі існуе таксама жанр вальсу. Сапраўды, гэтыя тры танцы з'явіліся на тэрыторыі Беларусі ў адзін час (XIX ст.), ім у роўнай ступені было нададзена стылёвае аблічча і ўласцівасці традыцыйнага беларускага танца. Даволі часта сустракаюцца шматлікія вальсы ў сумежным харэаграфіі жанры - музыцы. На наш погляд, Ю.М.Чурко не вылучыла вальс у асобную падгрупу ў сувязі з асіміляцыяй дадзенага танцавальнага жанру ў беларускай культуры з падгрупай полек.

У групе танцаў класіфікацыі Ю.М.Чурко апошнюю падгрупу складаюць гарадскія бытавыя танцы, якіх няма ў сістэмах іншых аўтараў. Пытанне аб вылучэнні самых позніх па часе з'яўлення ў культуры беларусаў танцаў мае, на наш погляд, складаны і супярэчлівы характар. Падгрупу складаюць спрошчаныя беларускія традыцыйныя і замежныя танцы, якія выконваліся ў вёсках на сваю манеру, "як прывыклі" і «як умелі» (таму часцей за ўсё ад замежнага танца пакідалі толькі рытм і музычны памер), а таксама гарадскія танцы, якія ў сваёй аснове мелі ўжо змяшаную жанравую, структурную і стылістычную «кашу». Па марфалагічнаму прынцыпу Ю.М.Чурко вылучае блокавую структуру гарадскога-бытавога танцу, што дае падставы аднесці гэты від танца ў асобную падгрупу [6, с. 243], але падобную кампазіцыю таксама мелі і іншыя падгрупы беларускага народнага танца. На наш погляд, існуе праблема вырашэння месца дадзенай падгрупы народных танцаў, магчыма, яе трэба пакінуць толькі ў гісторыі новай і сучаснай побытавай харэаграфіі.

У сваю чаргу, традыцыйны беларускі танец падзяляецца паводле тыпу і арганізацыі руху на ілюстрацыйна-выяўленчы, арнаментальны і гульнёвы, першы з якіх магчыма падзяліць паводле крытэрыя аб'екта адлюстравання на танцы, якія адлюстроўваюць працоўныя працэсы, з'явы прыроды, характар паводзінаў чалавека, рухі жывёлаў і птушак [2, с. 148-192].

Крытэрам класіфікацыі карагодаў з'яўляецца жанр, які дамініруе ў цесна звязанай сукупнасці танца, песні і драматычнай дзеі. Такім чынам існуюць песенныя, гульнёвыя і танцавальныя карагоды. Л.К.Алексютовіч вылучае групу карагоднага шэсця, але далей даследчыкі прыходзяць да слушнай высновы азначэння дадзенага віду песенным карагодам. Ю.М.Чурко карагодную гульню вылучае як падгрупу гульнёвага карагоду [6, с. 96].

Беларускі харэаграфічны фальклор М.А.Козенка класіфікуе згодна з гісторыка-стылявымі пластамі. Аўтар выЛучае танцы раннетрадыцыйныя, куды ўваходзяць карагоды, беларускія традыцыйныя танцы і скокі, падпарадкаваныя абрадавай функцыі, і познетрадыцыйныя, у межах гэтай групы існуюць асіміляваныя танцы, якія выконваюць пазаабрадавую функцыю. Падаецца, гэтая класіфікацыя можа быць універсальнай для ўсіх жанраў вуснай народнай творчасці. Акрамя таго аўтар робіць шматузроўневы падзел беларускага харэаграфічнага фальклора (акрамя групы скокаў) паводле крытэраў функцыі, жанру, стылю, складу выканаўцаў.

Такім чынам, у дачыненні да функцыі, якую выконвае той ці іншы харэаграфічны ўзор, карагоды і танцы могуць быць абрадавымі, прымеркаванымі да абрада і пазаабрадавымі. Неабходна дадаць, што абрадавы танец з'яўляецца раннетрадыцыйным, уключае ў сваю групу беларускія традыцыйныя танцы, а пазаабрадавы, суадносна,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

познетрадыцыйны, з падгрупамі полек, кадрыляў і вальсаў у сваім складзе. Функцыю прымеркаванасці да абраду могуць выконваць танцы абодвух гісторыка-стылявых пластоў.

Дыферэнцыяцыя паводле жанру намі была акрэслена вышэй, гэты аспект класіфікацыі мы прынялі за асноўны. Паколькі жанр характарызуе і марфалагічная структура, тут супадаюць меркаванні аўтараў розных класіфікацый. Крытэр стылю мае ў сабе сістэму падкрытэраў: паводле лексікі, драматургічнй кампазіцыі, малюнку і формы для карагодаў і паводле лексікі, кампазіцыі і структуры для танцаў. Тут узнікаюць пытанні да аўтара: чаму ён лічыць малюнак і форму ўласцівасцю толькі карагодаў, а структуру - уласцівасцю танцаў? Пры разглядзе наступных ступеняў класіфікацыі, узнікае выснова, што яны маюць розныя падставы: лексіка ў групе карагодаў падзяляецца на рэгламентаваную і нерэгламентаваную, а танцавальная лексіка класіфікуецца па тыпу, форме і суб'екту. Такім чынам, у карагодах крытэрыем класіфікацыі з'яўляецца сам факт рэгламентаванасці, а ў танцах - лексічны склад. Крытэрый кампазіцыі таксама адрозніваецца для дзвюх груп народнай харэаграфіі: для карагодаў - колькасць фігур (аднафігурныя і шматфігурныя), для танцаў - характарыстыка кампазіцыі як устойлівай, свабоднай і мяшанай. У той жа час аўтар раздзяляе танцы паводле крытэрыя структуры па колькасці фігур, матываў, каленаў. Такім чынам, колькасць фігур у харэаграфічным узоры ў выпадку карагодаў вылучаецца крытэрам формы, а ў выпадку танцаў - крытэрам структуры.

Класіфікацыя складу танцораў адбываецца паводле ўзроставых, гендэрных падстаў, колькаснага складу, а таксама сюды далучаецца народная тэрміналогія, што выклікае пэўныя пытанні.

Трэцяя жанравая група - скокі, выклікае найменш пытанняў. Ю.М.Чурко вылучае формы пераплясаў, сольных, гуртовых і масавых танцаў паводле колькасці ўдзельнікаў. М.А.Козенка класіфікуе скокі паводле гендэрнага складу, колькасці выканаўцаў, што нельга прыняць адназначна.

Такім чынам, у сферы беларускай харэаграфіі існуе шэраг актуальных праблем, якія патрабуюць якаснага вырашэння, у прыватнасці тэарэтычных асноў класіфікацыі танца, матэрыяльных аспектаў праблематыкі, галоўнымі з якіх з'яўляецца адсутнасць сістэматызаванага запісу узораў беларускай харэаграфічнай творчасці ў даступным шырокаму карыстальніку выглядзе. Перашкодай у развіцці і папулярызацыі танцавальнага фальклору з'яўляецца таксама недастатковасць увагі да тэмы сучаснымі даследчыкамі і, як следства, адсутнасць навуковых прац і падручнікаў. Музычныя запісы, дапасаваныя да фальклорнай харэаграфіі, прадстаўлены мінімальнай колькасцю, што не можа спрыяць шырокаму выкананню і распаўсюджанню танцаў.

Патрэба беларускага грамадства ў вывучэнні, асэнсаванні і захаванні беларускага харэаграфічнага фальклору відавочная: існуе неабходнасць у стварэнні нацыянальных маркераў і знакаў ідэнтычнасці беларусаў. Адна з самых архаічных, мова танца з'ўляецйа унікальнай і непаўторнай, нацыянальнай па характары і вылучаецца сваёй універсальнасцю ў якасці сродку культурных камунікацый.

**Спіс літаратуры:**


1. Атекоогавйч.ЛК Белфускигшродаыетаниы, хороводы, йгры/ЛКАлекаоговйч-Мінск: Вышэйшая шкала. 1978.-528 с.
2. Даследаванні лакальнай культуры Беларусі : Праграмы па зборы фальклорна-этнаграфічных матэр'ялаў / Навук. кір. праэкта, агульн. рэд.: Т.Б. Варфаламеева. - Мінск :БДУКМ, 2008. - 406 с.
3. Дубянецкі, Э.С. Кулыуралогія: энцыкл. даведнік / Э.С. Дубянецкі. - Мінск: БелЭн, 2003. - 384 с.
4. Краткий словарь по философии / авт.-сост. Н.Н. Рогалевич. - Минск: Харвест, 2007. - 832 с.
5. Традыиыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. - В. 3. - Мінск.: БелІПК, 2008. - 220 с.
6. Чурко, Ю.М. Белорусский хореографический фольклор / Ю.М. Чурко. - Мінск: Выш. шк., 1990.-415 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ